Андрэй ХУДЫК:

# «З КОЖНЫМ ГОДАМ НАША КРАІНА СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ ЗЯЛЁНАЙ»

**Адзіны дзень азелянення прайшоў у суботу ва ўсіх кутках краіны. У рамках экалагічнай акцыі «Разам для зялёнай Беларусі!», прымеркаванай да Года якасці, высаджана больш як 128 тысяч саджанцаў ліпы, клёна, дуба, рабіны, граба, елкі, каштана і іншых раслін.**



Такія «зялёныя» акцыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіць традыцыйна вясной і ўвосень. Па выніках 2023 года, пасаджана больш чым 346 тысяч дрэў і звыш 517 тысяч кустоў на прыдамавых і іншых тэрыторыях населеных пунктаў. Плошча азялененых тэрыторый у гарадах і раённых цэнтрах павялічылася на 901,11 га. У 131 населеным пункце краіны ўзровень азелянення дасягнуў неабходных па экалагічных нормах і правілах 40 %.

У экалагічных акцыях удзельнічаюць не толькі супрацоўнікі сістэмы Мінпрыроды, але і не абыякавыя да прыроды грамадзяне.



Сёлета на заклік «Разам для зялёнай Беларусі!» адгукнулася каля 10 тысяч чалавек: прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, устаноў адукацыі і грамадскасці. Дзякуючы сумесным намаганням плошча азялененых тэрыторый у нашых гарадах і вёсках няўхільна расце.

Адно са знакавых мерапрыемстваў адбылося ў паркавай зоне ў Першамайскім раёне сталіцы. Тут, на маляўнічым беразе Сляпянскай воднай сістэмы, супрацоўнікі Зелянбуда і цэнтральнага апарата Мінпрыроды разам з **кіраўніком прыродаахоўнага ведамства Андрэем ХУДЫКАМ** заклалі алею з 55 вербаў.

— З кожным годам наша краіна становіцца больш зялёнай. З'яўляецца больш зялёных насаджэнняў у гарадах. Усё больш населеных пунктаў дасягае ўстаноўленага працэнта азелянення, а гэта — у першую чаргу — здароўе нашых грамадзян. Па «зялёным» шляху рухаецца і наша эканоміка. Сённяшняя акцыя — працяг гэтай вялікай працы, — адзначыў Андрэй Худык.

Да пасадкі дрэў на беразе Сляпянскай воднай сістэмы далучыліся і прадстаўнікі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя (Белгідрамета).

— Белгідрамет заўсёды падтрымлівае Мінпрыроды ў такіх акцыях. І акцыя «Разам для зялёнай Беларусі!» не выключэнне. Сёння ў дапамогу выйшаў працоўным дэсантам амаль увесь калектыў Белгідрамета, — паведаміў **Андрэй КАРАБЧУК, начальнік службы міжнароднага супрацоўніцтва і сувязяў з грамадскасцю.** — На тэрыторыі Беларусі нашымі супрацоўнікамі будзе пасаджана прыблізна 2100 дрэў і каля 150 кустоў розных парод — альбо на сваіх тэрыторыях, альбо сумесна з абласнымі камітэтамі.

У рамках экалагічнай акцыі ў сталіцы таксама праводзіліся пасадкі на тэрыторыі зоны адпачынку «Спякота» ў раёне вуліцы Карзюкі, на праспекце Пераможцаў уздоўж МКАД, каля гандлёвага цэнтра «Першы нацыянальны гандлёвы дом», размешчанага на скрыжаванні праспекта Незалежнасці і вуліцы Кірылы Тураўскага. Збіраліся леташняя лістота, бытавое і будаўнічае смецце, сухія галінкі.

— Пытанні азелянення Мінска знаходзяцца ў прыярытэтным кірунку, — паведаміла **намеснік старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Таццяна ДУБІК.** — У Год якасці асабліва шмат увагі аддаецца якасці пасадачных матэрыялаў, тэхналогіі пасадкі, работ па доглядзе. Хацелася б нагадаць усім неабыякавым грамадзянам, што наш горад — чысты, прыгожы і зялёны. Дасягнуць гэтага выніку можна толькі сумеснымі намаганнямі.

**Александрына ПАРШЫНА.**
**Фота Віктара ДРАЧОВА.**

Далучайся!

# ТАЛАКОЙ — ЗРУЧНА

## Рэспубліканская акцыя «Адновім лясы разам» набірае абароты на Брэстчыне

**Сёлета рэспубліканская акцыя Міністэрства лясной гаспадаркі краіны «Адновім лясы разам» стартавала на Брэстчыне, у Гарадзішчанскім лясніцтве Баранавіцкага лясгаса. Усяго на пасадку лесу разам выйшлі каля 80 чалавек, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, моладзі.**



Вучні Чарнаўчыцкай сярэдняй школы.

**Першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр ДРАГУН,** які ўдзельнічаў у акцыі, падкрэсліў, што сёлета асаблівая ўвага ўдзяляецца якасці. Важна забяспечыць не толькі аб'ём пасадак, але і высокую якасць работы, каб маладыя саджанцы добра прыняліся і ў свой час сталі дружнай лясной дзялянкай. Намеснік міністра паведаміў, што летась падчас падобнай кампаніі ў краіне было пасаджана крыху больш за шэсць тысяч гектараў лесу, у гэтым годзе плануецца пасадзіць на плошчы не менш за шэсць з паловай тысячы гектараў.

**Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім АЛЬШЭЎСКІ** нагадаў, што акцыю «Адновім лясы разам» Брэсцкая вобласць пачынае адной з першых. Да гэтай пачэснай справы, якая накіравана на аднаўленне лясного багацця, на экалагічны дабрабыт будучых пакаленняў, далучаецца ўсё больш людзей.

У Ганцавіцкім раёне першымі да акцыі далучыліся пярвічныя арганізацыі БРСМ на чале з першым сакратаром раённага камітэта Анастасіяй Гурман. У адзін з апошніх дзён сакавіка працоўны дэсант высадзіўся на тэрыторыі Круговіцкага лясніцтва. На лясной дзялянцы добра папрацавалі прадстаўнікі пярвічных арганізацый Ганцавіцкага лясгаса і раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.

А на Піншчыне добрую справу падтрымалі медыцынскія работнікі раёна. Цэлы атрад медыкаў накіраваўся ў прыгараднае лясніцтва. **Ала ВАЙТОВІЧ, урач па медыцынскай прафілактыцы Пінскай цэнтральнай паліклінікі,** сказала, што яны з калегамі ўмеюць не толькі лячыць людзей, але аказаліся і спраўнымі рабочымі па пасадцы лесу: «Дробны дожджык не стаў перашкодай рабоце, мы працавалі з пачуццём уласнага дачынення да справы аднаўлення лясоў роднай краіны і паляпшэння навакольнага асяроддзя».

— Да пачэснай справы далучаюцца многія і многія жыхары абласнога цэнтра. У ліку першых акцыю падтрымалі вучні і настаўнікі школ, дзе працуюць школьныя лясніцтвы, — сказала карэспандэнту газеты **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Брэсцкага лясгаса Ірына ФАНДОРКА.** — Напрыклад, вучні са школьнага лясніцтва «Зялёная школа» брэсцкай СШ № 8 імя У. М. Карвата працавалі на пасадцы лясных культур у Мухавецкім лясніцтве. Хлопчыкі і дзяўчынкі пасадзілі дзялянку плошчай у паўгектара з саджанцаў сасны і бярозы. На наступны дзень акцыю падтрымала школьнае лясніцтва СШ № 14 імя Я. М. Фаміна ў гэтым жа лясніцтве. Вельмі адказна і старанна працавалі ўдзельнікі школьнага лясніцтва Чарнаўчыцкай сярэдняй школы Брэсцкага раёна ў 193-м квартале Чарнаўчыцкага лясніцтва.



Вучні СШ № 8 горада Брэста.

Прадстаўнікі ўжо цэлага шэрагу школ Брэста выязджалі на пасадку дрэў. Напрыклад, вучні і настаўнікі сярэдняй школы № 37 пабывалі ў Мяднянскім лясніцтве Брэсцкага лясгаса. Школьнікі ганарацца тым, што зрабілі ўнёсак у агульную справу. На сайце школы яны пакінулі справаздачу аб выніках працоўнага дэсанта, паведамілі, што высадзілі 600 саджанцаў сасны, 500 — бярозы, 300 — ясеня, па 200 — дуба і клёна.

Талаку падтрымалі супрацоўнікі ўстаноў і арганізацый абласнога цэнтра, студэнты Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

— У Драгічынскім раёне акцыя набірае абароты, — паведаміла **намеснік дырэктара Драгічынскага лясгаса па ідэалагічнай рабоце Алена ТАЎСТЫКА.** — На канец гэтага тыдня працоўныя дэсанты запланавалі прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады, супрацоўнікі аддзелаў МНС і Следчага камітэта, «Белдзяржстраха», іншых арганізацый. Папрацавалі ўжо члены БРСМ, школьнікі, навучэнцы каледжа. Такім чынам, добрая справа набывае ўсё больш прыхільнікаў.

**Генеральны дырэктар Брэсцкага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Анатоль ЛЕВАНЮК** паведаміў, што летась у Брэсцкай вобласці падчас акцыі было пасаджана каля 500 гектараў лесу, на гэты год запланавана звыш 600 гектараў, а ўсяго сёлета ў рэгіёне будзе высаджана больш за 2,5 тысячы гектараў лесу.

У Міністэрстве лясной гаспадаркі распрацавалі прыгожую наглядную агітацыю з нагоды акцыі. На адным з плакатаў напісана, што талака па аднаўленні беларускіх лясоў прысвечана Году якасці. Каб прыняць удзел, дастаткова звярнуцца ў найбліжэйшае лясніцтва ці лясгас і заявіць аб сваім жаданні. Акцыя прадоўжыцца да 20 красавіка.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Брэсцкага лясгаса.**

Меркаванне

# ЯКАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ГАСЦІННАСЦІ

**Пра нашу беларускую гасціннасць мне ўжо даводзілася выказваць сваё меркаванне ў прэсе. Цяпер, калі 2024 год аб'яўлены Годам якасці, лічу неабходным вярнуцца да гэтай няпростай тэмы, якая закранае інтарэсы ўсяго грамадства.**

Год якасці аб'яўлены з вялікімі мэтамі: гэта і павышэнне якасці жыцця насельніцтва краіны, і забеспячэнне канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі ў свеце, і стымуляванне ініцыятывы. Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам пастаўлена важная, змястоўная задача — сфарміраваць у грамадстве адказнасць за вынікі працы, за перадачу годнай спадчыны будучым пакаленням нашай краіны, зрабіць так, каб «якасць пранізвала кожнага чалавека».

Значыць, гэта датычыцца і якасці беларускай гасціннасці як абагульняльнага індыкатару якаснага жыцця беларускага народа.

«Гасціннасць — адзін з галоўных беларускіх брэндаў, якім мы вельмі ганарымся і перадаём з пакалення ў пакаленне», — так выказаўся кіраўнік дзяржавы на пачатку Года якасці, падкрэсліўшы, што гэты брэнд трэба развіваць і ўдасканальваць.

Магу пацвердзіць на ўласным вопыце: мне неаднойчы даводзілася чуць станоўчыя водгукі пра беларускую гасціннасць, пра высокую якасць беларускай прадукцыі як у блізкім, так і ў далёкім замежжы. Што і казаць: прыемна, калі за мяжой так гавораць пра наш народ.

Дык што ж гэта такое — беларуская гасціннасць? Што ў ёй, сённяшняй, ад традыцый мінулага, а якія новыя рысы яна набыла ў нашы дні?

Беларускае грамадства з даўніх часоў характарызуюць як талерантнае. Яшчэ з эпохі Вялікага Княства Літоўскага на гэтай тэрыторыі мірна суіснавалі розныя рэлігіі, розныя нацыянальнасці і розныя культуры. Традыцыі талерантнасці і міралюбівая знешняя палітыка беларускай дзяржавы з'яўляюцца трывалым падмуркам нашай гасціннасці, бо ўся гісторыя Беларусі грунтуецца менавіта на міры і згодзе прадстаўнікоў усіх народаў, якія жылі і жывуць цяпер на нашай зямлі.

Прыкладам міжканфесійнага і міжнацыянальнага суладдзя з'яўляецца мой родны Іўеўскі раён Гродзеншчыны, дзе больш як шэсць стагоддзяў пануюць добрасуседскія адносіны паміж людзьмі розных нацыянальнасцяў і розных веравызнанняў, дзе на цэнтральнай плошчы горада Іўе ўзвышаецца памятны знак-абеліск «У гонар дружбы і згоды канфесій Іўеўшчыны» як сімвал мірнага і шчырага пажыццёвага ўзаемадзеяння праваслаўных, католікаў, мусульман і іўдзеяў, дзе створаны і дзейнічае адзіны ў Беларусі музей нацыянальных культур.

Сёння беларуская гасціннасць — гэта адкрытасць нашай краіны свету. За 2023 год Беларусь наведалі грамадзяне 174 дзяржаў. Толькі ў першым квартале гэтага года па бязвізавым рэжыме ў нас пабывала амаль 60 тысяч жыхароў Еўрапейскага саюза. Хачу падкрэсліць: бязвізавы рэжым — вельмі важны паказчык беларускай гасціннасці. У той час, калі для беларусаў раз за разам узнікаюць штучныя бар'еры для наведвання некаторых краін, мы не ідзём на надуманыя абмежаванні ў перамяшчэнні людзей.

Нам ёсць чым ганарыцца, ёсць што паказаць гасцям, ёсць чым пачаставаць. Гэта і помнікі гісторыка-культурнай спадчыны, і мемарыялы памяці гераічнага мінулага, і адбудаваныя пасля Вялікай Айчыннай вайны нашы гарады і пасёлкі, і шырокая сетка пунктаў грамадскага харчавання з беларускай нацыянальнай кухняй. Папулярнасцю сярод замежных гасцей, асабліва ў расіян, карыстаюцца беларускія медыцынскія ўстановы і санаторыі — а гэта азначае, што якасць лячэбных і аздараўленчых паслуг у названых установах адпавядае высокім сучасным патрабаванням.

Аднак не будзем, як кажуць, спачываць на лаўрах. Усім нам зразумела: якасць і гасціннасць — гэта найперш пра чалавека, пра кожнага з нас. Якія мы, як адносімся да працы, як ставімся адно да аднаго, як выхоўваем сваіх дзяцей і ўнукаў.

«Якасць пачынаецца з душы, гэтую якасць трэба перш за ўсё выхаваць у сабе», — так выказаўся ў адной з тэлепраграм протаіерэй Фёдар Поўны. Нельга не пагадзіцца з вядомым святаром.

І тут, на мой погляд, праблем значна болей, чым у вытворчай сферы, дзе якасць прадукцыі часцей за ўсё залежыць ад тэхналагічнага ўзроўню прадпрыемства.

У мяне няма намеру, і гэта немагчыма, акрэсліць у дадзеных нататках усё кола пытанняў якасці чалавека. Закрану толькі тыя, якія непасрэдна ўплываюць на якасць беларускай гасціннасці.

Сустракаць гасцей хлебам-соллю, адводзіць ім месца на покуці — спаконвечная традыцыя на беларускай зямлі. Хлеб — сімвал дабрабыту, дастатку, а соль — найлепшы абярэг. Прымаючы такім пачэсным чынам гасцей, гаспадары жадаюць ім шчасця, дабра і міру.

Нашы папярэднікі рабілі гэта шчыра, нязмушана і самі пра сваю гасціннасць не гаварылі. А сёння?

У гарадах і раёнах нашай краіны на розных мерапрыемствах мне даводзілася чуць у прамовах, асабліва з вуснаў кіраўнікоў мясцовай вертыкалі: «Мы рады вітаць вас на гасціннай (глускай, клічаўскай, калінкавіцкай і г. д.) зямлі...» Калі маецца на ўвазе хараство нашай зямлі, то так казаць магчыма: зямля ў нас, куды ні паедзеш, сапраўды прыгожая, і ўжо сваёй прыгажосцю з'яўляецца падмуркам нашай гасціннасці. Бо гасціннасць — першым чынам утульнасць, прывабнасць для душы вандроўніка, які апынецца тут. А калі мы хочам падкрэсліць, што зрабілі ўсё магчымае, каб кожны госць адчуваў тут асаблівую сардэчную цеплыню гаспадароў, то ў такім выпадку гаспадарам не варта гаварыць пра сваю гасціннасць, няхай лепш пра гэта скажуць госці.

Гаварыць самім пра сваю гасціннасць стала ўжо недарэчным шаблонам. «Наша земля белорусская гостеприимная...» — прамаўляе ў расійскай тэлепраграме Андрэя Малахава «От всей души» (03.03.2024) удзельніца перадачы з аграгарадка Прылукі. Ці не лепш было б сказаць: «Мы, беларусы, любім сустракаць і прымаць гасцей, частаваць іх...»?

Зрэшты, і мы, айчынныя літаратары, і браты-журналісты грэшныя ў гэтым. Неаднойчы я сустракаў радкі пра беларускую гасціннасць і ў паэтычных творах, і ў публікацыях на старонках перыядычных выданняў.

Трэба яшчэ памятаць вось што: госці на тое і госці, каб не быць ашчаднымі ў словах падзякі, гаворачы, які цёплы прыём аказалі ім гаспадары. Выходзіць, што гасціннасць — рэч больш аб'ектыўная, чым суб'ектыўная. І ад слоў гаспадароў, і ад слоў гасцей яна мала залежыць. Паўстае пытанне: ад чаго?

Вядома ж, ад якасці паслуг — найперш. Чарка на пасашок — гэта добра, гэта ў нашым менталітэце. Але гэта такая дробязь у агульнай практыцы гасціннасці. А вось іншыя «дробязі» часам знішчаюць усе нашы найлепшыя намеры паказаць сваю гасціннасць. У інтэрнэтнай інфармацыйнай прасторы шмат водгукаў турыстаў, якія наведалі Беларусь. Большасць з іх — станоўчыя, прыемныя. Але шмат і такіх, ад якіх крыўдна і сорамна.

Прывяду толькі адзін факт, які не ўкладваецца ў паняцце гасціннасці, пра што мне расказалі знаёмыя масквічы. Яны прыязджалі ў Брэст да сваіх сяброў, з якімі калісьці пазнаёміліся падчас курортнага адпачынку на моры. І, зразумела, не маглі не наведаць мемарыяльную святыню.

У музейным комплексе «Брэсцкая крэпасць — герой» ёсць кавярня «Цытадэль». Вандроўнікі-госці папрасілі афіцыянта прынесці для аднагадовай дачушкі бутэрброд з маслам: любіць такую ежу дзіця. Праз некалькі хвілін афіцыянт вяртаецца і разводзіць рукамі:

— Не магу выканаць гэтую просьбу...

— У вас няма на кухні батона і масла? — перапытвае маці.

— Масла ёсць, але няма бухгалтара, каб падлічыць, колькі яго пойдзе на бутэрброд. Сёння выхадны ў бухгалтэрыі...

Працягваць размову не мела сэнсу... Бацька дзяўчынкі схадзіў у найбліжэйшы прадуктовы магазін і вырашыў гэтую праблему...

Дробязь? Так. Але падобныя дробязі, на жаль, чакаюць гасцей шмат дзе. А іх не павінна быць, калі мы лічым сябе гасціннымі.

Гэта, безумоўна, залежыць ад гасціннасці канкрэтнага чалавека, ад агульнага ўзроўню паслуг, ад нашай агульнай культуры. Калі гэтыя паняцці супадаюць, то і такіх дробязяў не ўзнікае.

Мне даводзілася бачыць і чуць расчараванне турыстаў, калі ім гаварылі, што ў горадзе няма кніжнай крамы. Ці адпавядае такі горад статусу горада? А такіх «гарадоў» у сённяшняй Беларусі не адзін і не два, а дзясяткі. І нельга апраўдаць гэтую сітуацыю тым, што шырокае распаўсюджванне ў апошні час атрымаў інтэрнэтны кніжны гандаль: для большасці насельніцтва такая паслуга наўрад ці даступная.

Ды што гаварыць пра высокія духоўныя запатрабаванні, калі ў многіх нашых гарадах і раённых цэнтрах да гэтага часу належным чынам не вырашана праблема грамадскіх прыбіральняў. Падчас масавых святочных мерапрыемстваў устанаўліваюцца біятуалеты, а пасля свят яны знікаюць. Лічу, што ў Беларусі на сёння ёсць рэальныя магчымасці паўсюдна зрабіць грамадскія прыбіральні бясплатнымі. Не такія ўжо вялікія грошы патрэбныя на іх утрыманне ў параўнанні з іншымі затратамі ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы краіны. Гэта стала б яшчэ адным добрым знакам нашай гасціннасці.

Самае небяспечнае, што можа прывесці да зніжэння ўзроўню беларускай гасціннасці, — гэта наша абыякавасць да ўсяго, што робіцца вакол нас. Калі, не дай бог, забудзем, што мы — беларусы, што наша гасціннасць — гэта наша людскасць.

Адна знаёмая мінчанка з горыччу расказала мне аб тым, што яна вельмі хацела запрасіць гасцей з замежжа да сябе ў кватэру, але не рашылася: «Пад'езд і ліфт шматкватэрнага дома так «скалечаны», што самой сорамна заходзіць у яго...» І ёй давялося прызначыць сустрэчу з гасцямі ў рэстаране.

У рэшце рэшт, гасціннасць — гэта наш лад жыцця, наш стыль жыцця. Якасць гасціннасці — яна ва ўсім: у абслугоўванні ў гасцініцах, аграсядзібах і музеях, у адносінах да старэйшага пакалення і грамадскай маёмасці, у паводзінах у грамадскіх месцах. І, што вельмі важна, у культуры нашай гаворкі. Яна можа быць на роднай мове, можа быць рускамоўнай, але з павагай да субяседніка і да тых, хто побач з намі. Грубасць не ведае, ці госць побач з вамі, ці суайчыннік. Ды і ніякага падзелу на сваіх і чужых тут быць не можа. Выкараняць яе трэба агульнымі высілкамі паўсюдна: і ў працоўных калектывах, і ў месцах адпачынку, і ў грамадскім транспарце.

Толькі ў рашучым ачышчэнні грамадства ад гэтых негатыўных з'яў, пастаянным імкненні да ўсталявання высокіх духоўна-маральных каштоўнасцяў можна будзе гаварыць пра нашу сапраўдную гасціннасць.

Вось чаму нашы клопаты пра якасць беларускай гасціннасці Годам якасці не павінны скончыцца. Нам трэба з году ў год настойліва працягваць традыцыі хлебасольнасці, якія мы атрымалі ў спадчыну, і развіваць усё найлепшае, да чаго мы дадумаліся ў наш час, што практыкуем сёння.

**Іван КАРЭНДА.**

Надвор'е

# АМАЛЬ ЛЕТА

## Суперцяпло, праўда, прыйдзе да нас толькі на пару дзён

**Як ні круці, а тэмпература паветра на гэтым тыдні будзе дасягаць чэрвеньскіх значэнняў. Як адзначылі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, першыя выхадныя красавіка вярнулі ў нашу краіну цяпло.**

У першай палове гэтага тыдня ў Беларусі пад уплывам антыцыклону OLLI будзе пераважна сухое і сонечнае надвор'е, што ў спалучэнні з паўднёва-заходнімі вятрамі павысіць тэмпературу паветра днём да летніх значэнняў. Пачынаючы з чацвярга сітуацыя пачне мяняцца. Франтальны раздзел з Заходняй Еўропы прынясе ў краіну не толькі воблачныя масівы, але і пастунова выцесніць за межы нашага рэгіёна цёплыя паветраныя масы. Вось тады гаспадаром надвор'я стане больш свежае паветра. Разам з тым, нягледзячы на паніжэнне паказанняў тэрмометраў, у большасці раёнаў краіны тэмпература паветра па-ранейшаму будзе перавышаць кліматычную норму.

У аўторак пераважна будзе без ападкаў, толькі ноччу і раніцай месцамі па поўначы краіны пройдуць невялікія дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 8 да 14 цяпла, удзень — 21—27 градусаў.

Горача будзе і ў сераду. У гэты дзень пераважна будзе без ападкаў. Ноччу і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вар'іравацца ад 7 да 14 цяпла, удзень ад 20 да 27 градусаў са знакам плюс.

А вось у чацвер рэзка пасвяжэе. Таксама будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 4 да 10 цяпла, па паўднёвым усходзе да 12, днём — 11—18 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам, да канца тыдня час ад часу будуць адзначацца кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны суботы і нядзелі ў асобных раёнах краіны не выключана верагоднасць навальніц.

У пятніцу месцамі па краіне пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, удзень — 11—18 цяпла. У суботу месцамі па рэспубліцы пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай у асобных раёнах будзе слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе ад 3 да 8 цяпла, днём — ад 10 градусаў па паўночным усходзе да 20 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

У нядзелю зноў трошкі пацяплее. У гэтыя суткі ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 6—11 цяпла, днём — ад плюс 10 па паўночным захадзе да 21 градуса па поўдні краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**